АЛЯКСАНДР ЖУКОЎСКІ

# НАПРАМАК ЖЫЦЦЯ

Нататкі педагога
Вершы
Гумарэскі
Песні

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2014

УДК 821.161.1(476)–1
ББК 84(4Беи)–5
Ж86

**Жукоўскі, А. М.**

Ж86 Напрамак жыцця : нататкі педагога, вершы, гумарэскі, песні / Аляксандр Жукоўскі. — Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2014. — 140 с.

ISBN 978-985-7103-24-9.

Аляксандр Жукоўскі доўгі час працаваў настаўнікам. У замалёўках «Нататкі педагога» распавядаецца пра цікавыя моманты з лёсу галоўнага героя Івана Фёдаравіча Чайкоўскага, прататыпа аўтара, педагагічная дзейнасць якога праходзіла ў 60—80-я гады ХХ стагоддзя. Усе апісаныя падзеі не прыдуманыя, яны адбыліся насамрэч. Зменены толькі прозвішчы герояў і назвы населеных пунктаў.

У вершах гучаць думкі пра сэнс жыцця, выказваецца любоў да роднай зямлі, закранаецца тэма кахання. Некаторыя з іх пакладзены на музыку вядомым беларускім кампазітарам Эдуардам Зарыцкім. Гумарэскі, змешчаныя ў зборніку, напоўнены тонкай іроніяй і даюць зарад шчырага смеху.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**УДК 821.161.1(476)–1**
**ББК 84(4Беи)–5**

**ISBN 978-985-7103-24-9**

© Жукоўскі А. М., 2014
© Левановіч Л. К., прадмова, 2014
© Зарыцкі Э. Б., музыка, 2014
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2014

# Жыццёвыя ўрокі

Неяк зімовым вечарам сядзеў я каля грубачкі ў вясковай хаце. Патрэсквалі дровы, сцішана гаманіла радыё. Раптам голас з рэпрадуктара падаўся знаёмым, я прыбавіў гуку. Перадавалі рэпартаж з сесіі Мінскага абласнога савета, выступаў дэпутат з Клецка Аляксандр Жукоўскі, распавядаў пра дзейнасць сістэмы адукацыі, адзначыў, што ў райцэнтры тры сярэднія школы і ўсе — беларускамоўныя. Выступленне Жукоўскі скончыў пад гучныя воплескі залы. А я прыгадаў наша знаёмства.

Было гэта амаль дваццаць гадоў таму. Я працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура», загадваў сектарам публіцыстыкі. Мне даручылі наладзіць выпуск раённых кніг «Памяць». У спісе быў і Клецкі раён. Патэлефанаваў у Клецк, пацікавіўся, як рыхтуюцца матэрыялы. Гутарыў я са старшынёй раённай камісіі Аляксандрам Жукоўскім. А потым Аляксандр Мікалаевіч прыехаў у выдавецтва, пачалася наша сумесная праца. Сустракацца даводзілася часта.

Неўзабаве я пераканаўся, як глыбока ведае Жукоўскі гісторыю раёна, яго людзей, імкнецца, каб артыкулы былі змястоўныя, цікавыя, каб кніга была чытэльнай. Так і пачалося наша сяброўства.

Вядома, я згадзіўся прачытаць рукапіс яго новай кнігі. Так, новай, бо ў 2003 годзе ў Нясвіжы, у друкарні імя Сымона Буднага, ужо выходзіла невялікая кніжка вершаў і песень Аляксандра Жукоўскага.

Чым жа адрозніваецца гэтая кніга? У ёй ёсць новыя творы, а найперш — замалёўкі «Нататкі педагога». Гэта, па сутнасці, грунтоўны нарыс. Аўтар піша пра сябе,

пра свой жыццёвы шлях, схаваўшыся за псеўданімам Іван Чайкоўскі.

Апавядае аўтар проста, без літаратурных выкрунтасаў і розных прыдумак. Пра тое, як у вёску прыехаў па размеркаванні малады настаўнік, пачаў працаваць з поўнай аддачай, дняваў і начаваў у школе. Яго заўважылі, прызначылі дырэктарам васьмігодкі, потым перавялі на пасаду дырэктара сярэдняй школы. Затым даручылі кіраўніцтва вялікай школай у райцэнтры. Настаўнік даволі хутка ўздымаўся па кар'ернай лесвіцы, але, як з гумарам зазначае аўтар, «да міністра не дарос». Зрэшты, сельскім міністрам адукацыі ён быў, бо трынаццаць гадоў адрабіў на пасадзе загадчыка райана. Потым працаваў старшынёй раённага савета, абіраўся дэпутатам абласнога савета. Чыноўнік Аляксандр Жукоўскі ўвесь час пісаў вершы, дасціпныя гумарэскі. На яго словы кампазітар, народны артыст Беларусі Эдуард Зарыцкі напісаў некалькі песень. Можна сказаць, што кніга А. Жукоўскага ўнікальная. Разумею, яна не будзе мець вялікага накладу, але прачытаць яе было б карысна сучасным настаўнікам, асабліва маладым.

Аляксандр Жукоўскі — не прафесійны літаратар, у ягоных вершах пракідаюцца каструбаватыя радкі, але яны поўныя шчырасці, у іх ёсць думка і пачуццё любові да роднага краю, роднай мовы, ёсць любоў да чалавека, а гэта — галоўнае ў творы.

Зычу кнізе «Напрамак жыцця» знайсці дарогу да сэрца чытача.

*Леанід ЛЕВАНОВІЧ,*
*лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа,*
*прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі*

# НАТАТКІ ПЕДАГОГА

# Да міністра не дарос

У далёкія 60-я гады мінулага стагоддзя Іван Чайкоўскі, скончыўшы філалагічны факультэт БДУ, прыехаў па размеркаванні ў аддалены ад сталіцы раён.

У прыёмнай загадчыка райана, як заўсёды ў жніўні, сабралася столькі маладых спецыялістаў, што, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Выпускнікі ВНУ і сярэдніх спецустаноў хваляваліся, чакалі свайго «прысуду». Яны добра разумелі, што многіх з іх накіруюць у глухія вёскі, бо менавіта там заўсёды не хапае кадраў.

Дзяцінства Івана прайшло ў палескім сяле. Яно прыпала на суровыя гады вайны і перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі. Так што ўдосталь прыйшлося сербануць нястачы і гора. Таму ён рашыў сябе аддаць на волю лёсу: ехаць у глухамань, то, значыць, так і трэба. Больш за тое, выхаваны ў патрыятычным духу хлопец нават хацеў працаваць там, дзе ён будзе запатрабаваны.

Загадчык райана Пётр Захаравіч, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, уважліва разгледзеў Іванавы дакументы і прамовіў голасам, які не выносіць пярэчанняў:

— Накірую вас у Забалоцкую васьмігодку: там праблема з выкладаннем нямецкай мовы і гісторыі.

— Дык я ж выкладчык беларускай і рускай моў...

— Для таго каб вы набывалі вопыт па сваёй спецыяльнасці, — перапыніў яго загадчык райана, — вам дадуць магчымасць выкладаць мову і літаратуру ў пятым класе.

Чайкоўскі наогул не любіў спрачацца, а тым больш з начальствам. У думках ён прыкінуў сваё веданне прапанаваных яму для выкладання асноў на-

вук. Па гісторыі ў атэстаце за сярэднюю школу ў яго стаіць пяцёрка, па нямецкай мове — чацвёрка. Але калі ўлічваць паспяховую здачу залікаў і экзаменаў па гэтым прадмеце ва ўніверсітэце, то няўжо ж ён не зможа навучыць «шпрэхаць» школьнікаў пятых — восьмых класаў? Праз хвіліну Іван адрапартаваў:

— Я гатовы ехаць у Забалоцце.

Пётр Захаравіч ад радасці абняў маладога спецыяліста, моцна паціснуў яму руку і задаволена сказаў:

— Дастойная змена нам прыходзіць.

Чайкоўскі не стаў чакаць маршрутнага аўтобуса: па-першае, да яго адпраўлення заставалася больш чым дзве гадзіны; па-другое, ён усё роўна сем кіламетраў не даязджаў да населенага пункту, куды накіроўваўся Іван. І юнак вырашыў дабірацца на спадарожным транспарце. Аднак, нягледзячы на тое, што ён патрабавальна махаў рукой, машыны, не спыняючыся, імчаліся міма. Нарэшце, прытармазіў грузавік ГАЗ-51, і паколькі кабіна была занята, маладому педагогу давялося лезці ў кузаў. Івана гэта нікольку не засмуціла, бо яму даводзілася не толькі ездзіць на трактарным прычэпе ці возе, але і па трыццаць кіламетраў пехатою хадзіць у райцэнтр.

Шафёр спыніў машыну, як і прасіў Чайкоўскі, на павароце ў вёску Забалоцце, і хлопец з чамаданам у руках паплёўся да месца свайго прызначэння. Ён не спяшаўся: хацелася падумаць.

Паабапал пыльнай дарогі рассцілаліся шырокія палі, застаўленыя сціртамі саломы. Уборачная кампанія ўжо

завяршалася. Стаяла гарачае жнівеньскае надвор'е, але ўжо адчуваўся надыход восені: ночы ўпэўнена адваёўвалі свае пазіцыі, а спякотныя дні адступалі, станавіліся карацейшымі. Думкі плылі адна за адной: як яго сустрэнуць вучні, ці здолее ён, даўшы згоду ў раённым аддзеле народнай адукацыі, выкладаць «чужыя» прадметы. Гісторыю можна асіліць: вывучыў змест тэксту — і тлумач дзецям. А вось з нямецкай мовай — складаней. Праўда, чытаць і перакладаць са слоўнікам на рускую (беларускую) мову ён мог нядрэнна, але ж гэтага мала...

Ад нахлынулых думак Івана адарваў указальнік з надпісам «Забалоцце». Ён пазіраў на пабудовы, якія цягнуліся па абодва бакі вузкай брукаванай вуліцы. Саламяных стрэх тут не было, толькі некалькі хат вылучаліся гонтавымі дахамі. Астатнія вабілі вока шыферным пакрыццём. Пераважалі драўляныя дамы, але сустракаліся і цагляныя. Выгляд вёскі супакоіў Івана: тут, як відаць, не такая ўжо і глуш. Калі ён упершыню пачуў назву вёскі, куды атрымаў накіраванне, то ў яго па асацыяцыі ўзнік вобраз Куранёў з рамана Івана Мележа «Людзі на балоце». Аднак пейзаж, што паўстаў цяпер перад вачыма маладога спецыяліста, выклікаў радаснае пачуццё, і думкі, што валодалі ім, саступілі месца ружовым марам: ён распрацоўвае і паспяхова ўкараняе новыя метады і прыёмы вучэбна-выхаваўчай работы, яго заўважаюць, прызначаюць дырэктарам школы, потым — загадчыкам райана... міністрам...

Раптоўна летуценні перарваліся: насустрач ішла бландзінка сярэдняга росту, даволі зграбная. Параўняўшыся з Іванам, яна зыркнула блакітнымі вачамі-азёрамі, акінула хлопца з галавы да ног

пранізлівым паглядам і, ацаніўшы, відаць, невысокім балам яго годнасць, пакрочыла далей.

Юнак нейкі момант стаяў як укапаны. Адразу ўзнікла жаданне азірнуцца (як у той песні: «Я оглянулся посмотреть, не оглянулась ли она...»), аднак нейкае падсвядомае пачуццё спыніла гэты імгненны парыў.

Ён успомніў наказ загадчыка райана:

— Не забывайце, што сельскі настаўнік — фігура прыкметная. Кожны ваш крок незаўважаным не застанецца. Паводзьце, калі ласка, сябе прыстойна.

У новага сустрэчнага — а гэта быў мужчына гадоў сарака — Іван запытаў, дзе знаходзіцца школа. Атрымаўшы падрабязнае тлумачэнне, Чайкоўскі ў хуткім часе падышоў да будынка ў форме літары «Г», якую надала яму новая прыбудова з вялікімі квадратнымі вокнамі. Гэта і была школа. Будаўнікі, адзначыў у думках Іван, сумленна выканалі патрабаванне санслужбы пра добрае асвятленне ў вучэбных памяшканнях.

Дырэктар школы Рыгор Аляксандравіч сустрэў маладога спецыяліста надзвычай ветліва і пасля знаёмства выказаў задавальненне, што цяпер знікнуць праблемы з выкладаннем нямецкай мовы.

Пачалася педагагічная дзейнасць Івана Фёдаравіча Чайкоўскага. Нагрузілі яго «пад самую завязку»: у пятым класе, як і абяцаў загадчык райана, даручылі выкладаць рускую мову і літаратуру, а ў астатніх — гісторыю і нямецкую мову; прызначылі класным кіраўніком, а неўзабаве на справаздачна-выбарчым сходзе абралі старшынёй прафсаюзнага (мясцовага) камітэта. Кіраваліся такім пастулатам: малады — дык няхай цягне, каб работа раем не здавалася.

Іван Фёдаравіч з імпэтам узяўся за справу. Правёўшы пяць–шэсць урокаў, арганізоўваў пазакласныя мерапрыемствы, пасля пачыналася грамадская дзейнасць: пасяджэнні мясцкама, прафсаюзныя і камсамольскія сходы, палітмасавая работа сярод насельніцтва і г. д. Як выціснуты лімон, вяртаўся вечарам у кватэру, дзе яго чакала падрыхтоўка да заняткаў (чытанне літаратуры, праверка сшыткаў, складанне планаў). З рускай мовай і літаратурай праблем магло б і не быць, калі б усе дзеці добра вучыліся. Але ж, як на бяду, з пятнаццаці вучняў пяць пісалі дыктанты на адзінкі і двойкі. Атрымаўся парадокс: з пачатковага звяна гэты клас выпусціла найлепшая настаўніца Марыя Сяргееўна. Іван Фёдаравіч здзівіўся, як магло так здарыцца.

Аказалася, што тады было строга забаронена пакідаць вучняў у першым і другім класах на другі год. І калі бацькі не згаджаліся адпраўляць дзяцей з запаволеным інтэлектуальным развіццём у дапаможныя школы–інтэрнаты, то прыходзілася гэтых вучняў пераводзіць з класа ў клас, хоць яны ў слове «мама» дапускалі па дзве памылкі. І яшчэ адна прычына такога становішча: у савецкай школе квітнела працэнтаманія. Не дай бог, каб у класе, скажам, трэцяя частка была двоечнікаў. Тады настаўніку пагражала суровая крытыка на розных нарадах, сходах, у перыядычным друку; а іншы раз — дысцыплінарнае спагнанне. Таму замест адзінак і двоек вучням ставілі тройкі.

І вось у Забалоцкую школу прыехаў інспектар Міністэрства асветы БССР пракантраляваць веды вучняў па рускай мове. Ён прывёз тэксты дыктантаў

для ўсіх класаў. Методыка іх правядзення была наступная: настаўнік дыктуе, вучні пішуць, інспектар збірае сшыткі, дае на праверку настаўніку, а потым правярае сам.

Іван Фёдаравіч зразумеў, што калі не прыняць якіх-небудзь тэрміновых мер, то яго кар'еры — канец. І ён асмеліўся здзейсніць учынак, аб якім у сістэме адукацыі тады нават і думаць не маглі. Філолаг рашуча ўвайшоў у класны пакой, расчыніў насцеж акно (гэта было вясной) і гучна крыкнуў:

— Двоечнікі, ратуйцеся: інспектар прыехаў!

Пяцярых як карова языком злізала: яны такога далі драпака, што толькі пяткі заблішчалі. Вучні, якія засталіся, вядома, паспяхова справіліся з дыктантам. І гэта быў пачатак кар'еры Івана Фёдаравіча. Прозвішча Чайкоўскага загучала на раённых настаўніцкіх нарадах, яго вопыт пачалі вывучаць і ўкараняць, пра яго пісалі ў газетах і часопісах. Ён стаў дырэктарам, пазней — загадчыкам райана... Праўда, да міністра не дарос.

## «Выхаваўчы момант»

**1963/64** навучальны год для Івана Чайкоўскага быў першым на шляху яго педагагічнай дзейнасці ў Забалоцкай васьмігодцы. І вось аднойчы дырэктар школы Рыгор Аляксандравіч папярэдзіў, што заўтра ён наведае ўрок рускай літаратуры ў пятым класе. Малады настаўнік заўсёды старанна рыхтаваўся да заняткаў, а тым больш да тых, што праводзіў у прысутнасці начальства.

# ЗМЕСТ

**Жыццёвыя ўрокі.** ***Л. Левановіч*** ........ 3

## НАТАТКІ ПЕДАГОГА

**Да міністра не дарос** ........ 6
**«Выхаваўчы момант»** ........ 11
**Пакараў сябе** ........ 13
**Высакароднае ашуканства** ........ 15
**Плюнуў супраць ветру** ........ 18
**Ратаваліся ад мух** ........ 20
**Выбраліся «з пекла»** ........ 21
**Партыйныя спагнанні** ........ 23
**«Педагагічнае пражэкцёрства»** ........ 25
**Стварыць умовы і — патрабаваць** ........ 28
**Слава паплыла па раёне** ........ 34
**Нарэшце ў райцэнтр** ........ 35
**Аўтарытэт рос** ........ 38
**Атэстацыя настаўнікаў** ........ 44
**Працаваць было нялёгка, але цікава** ........ 46
**Выдатная традыцыя** ........ 51
**Маскоўскія кантралёры** ........ 52
**Экскурсія ў братнія краіны** ........ 54
**Прафсаюзная дзейнасць** ........ 58
**Фармалізму — бой... Фармальны?** ........ 59

**Адгукніцеся, калегі!** ........ 65
**Запомніцца на ўсё жыццё** ........ 66
**Замест эпілога** ........ 73

## ВЕРШЫ

Напрамак жыцця ........ 76
Мой лёс ........ 76
Вадаспад ........ 77
Сумленне ........ 77
Навагодняе ........ 78
Настаўнік ........ 79
Мой вучань ........ 79
Наказ пенсіянеру ........ 80
Майму равесніку ........ 81
Лесаводы ........ 82
Нясмелая ........ 82

## ГУМАРЭСКІ

Сур'ёзна, але не без гумару ........ 84
Манька ........ 85
Сяўбу вясеннюю абмылі ........ 87
Вечар танцаў у санаторыі ........ 91
Не абысціся без мужчын ........ 93
Працэдура ........ 96
Канфуз ........ 98
Цыркачовы фокусы ........ 101

**ПЕСНІ**

***Музыка Эдуарда Зарыцкага***

**Некалькі слоў пра кампазітара Эдуарда Зарыцкага** ............ 106

Беларусь ............ 107

Служим Беларуси

*Гимн Минского областного управления МЧС Республики Беларусь* ........ *114*

Родны горад ............ 120

Сумны клён ............ 122

Ты для мяне... ............ 126

Твае вочы–азёры ............ 131

**Пра аўтара** ............ 136